ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дарожным дадаткам «Прафрух»)
На 1 мес. . . — 60 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок комп. пасьля тэксту—50 к., іншагародніх абвестак—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка, згодна тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. ведамству.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў галоўнай канторы газ. „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ЗЬВЯЗДА

Пралетары усіх краёў, злучайцеся!

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
„ абвестак . . 7-81

АЎТОРАК, 5 жніўня 1930 г.
№ 181 (3779)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА
МЕНСК, Савецкая, 63.

У САЮЗЕ З ІНТЭРВЭНТАМІ

Напярэдадні 10-й гадавіны вызваленьня Савецкай Беларусі ад белапалякаў, на старонках «Зьвязды» былі апублікаваны дакуманты, якія праліваюць новае сьвятло на контр-рэвалюцыйную дзейнасьць беларускага нацыянал-дэмакратызму ў мінулым.

Несумненна, што гэтыя дакуманты маюць вялікую гістарычную цікавасьць. Але самае важнае заключаецца ў тым, што яны маюць **актуальнае значэньне**, маюць ня толькі таму, што праліваюць новае сьвятло на ролю беларускай контр-рэвалюцыі **ў мінулым**, але што яны вядуць простым шляхам да дзейнасьці і змаганьня беларускай контр-рэвалюцыі супроць савецкай улады ў **сучасным**. Паміж контр-рэвалюцыйнай работай у мінулым і паміж тэю ролию, якую адыгрывае беларускі нацыянал-дэмакратызм у сучасным пэрыядзе клясавага змаганьня **ёсьць простая і непасрэдная сувязь**. Мінулае беларускай контр-рэвалюцыі **і яе сучаснае** — гэта адзін шлях змаганьня супроць пралетарскай дыктатуры, супроць працоўных Савецкай Беларусі, супроць камуністычнай партыі. Толькі абываталь можа адмаўляць ці ня бачыць простай нераемнасьці, якая існуе паміж мінулым беларускай контр-рэвалюцыі, якая так ярка малюецца ў апублікаваных дакумантах, і яе сёньнішнім днём, калі беларускі буржуазны нацыяналізм, **ставячы стаўку на замежную інтэрвэнцыю**, імкнецца да капіталістычнай рэстаўрацыі, да зьвяржэньня савецкай улады на Беларусі і ператварэньня яе ў калёнію замежнага капіталу.

Нацыянал-дэмакраты былі, і гэта яшчэ і яшчэ раз пацьвердзілі апублікаваныя дакументы, **непасрэднымі арганізатарамі і натхніцелямі ўзброенага змаганьня супроць Савецкай Беларусі.** Уся дзейнасьць беларускіх нацыянал-дэмакратаў, усіх гэтых гэроў высокапарных фраз аб «незалежнасьці», з гэта ланцуг неперарыўных памаганьняў, пакіраваных да скалачваньня, пры дапамозе інтэрвэнтаў і над іх непасрэдным кіраўніцтвам, узброеных сіл для змаганьня супроць краю пралетарскай дыктатуры. Усё **іх мінулае — гэта няспыненае ні на адну хвіліну змаганьне супроць працоўных савецкага краю, за аднаўленьне тут, на Беларусі, улады памешчыкаў і капіталістых.**

Ужо ў вядомай тэлеграме Вільгельму II — колькі было зусім яўнага поўзаньня перад ботамі нямецкага імпэрыялізму, як ярка была выкладзена ўся «праграма» беларускай контр-рэвалюцыі! ...«Рада Беларускай Народнай Рэспублікі, як выбранае прадстаўніцтва беларускага народу, зьвяртаецца да Вашай імпэратарскай вялікасьці са славамі глыбочайшай падзякі за вызваленьне Беларусі нямецкімі вайскамі ад цяжкага ўціску чужога пануючага зьдзеку і анархіі. Рада Беларускай Народнай Рэспублікі дэкларавала незалежнасьць цэльнае і недзялімае Беларусі і просіць вашую імпэратарскую вялікасьць аб абароне... Толькі пад абаронай германскай імпэрыі бачыць край сваю добрую долю ў будучыні...».

І ў залежнасьці ад умоў і абставін змаганьня, беларускі нацыянал-дэмакратызм зварачаўся з просьбай аб «абароне» ці да нямецкага, ці да польскага, ці да расійскага капіталу. Пад кіраўніцтвам інтэрвэнтаў, у непасрэдной сувязі з імі беларуская контр-рэвалюцыя ў часе ўсёй грамадзянскай вайны **актыўна, са зброяй ў руках**, змагалася супроць БССР. У залежнасьці ад гістарычных умоў, беларуская контр-рэвалюцыя ў цэлым і пасобныя яе групоўкі арыентаваліся на перамогу то аднэй, то другой больш магутнай імпэрыялістычнай сілы. Калі ў гістарычным мінулым беларускага нацыянал-дэмакратызму ёсьць вернападданьніцкія тэлеграмы Вільгельму II, калі мы там бачым простыя звароты да французскіх акупантаў, калі мы цяпер маем магчымасьць чытаць іх дакументы, зьвернутыя да расійскай белагвардзейшчыны, дык у гэтым мінулым мы бачым і падобныя-ж дакументы, зьвернутыя да бела-польскіх акупантаў. Вядома, што беларускія нацыянал-дэмакраты ў часе акупацыі Беларусі белапольскімі войскамі пісалі, што «беларускія дзеячы» ...«рашуча адмяжоўваючы ад якой бы то ні было палітычнай сувязі з Расіяй або Маскоўшчынай — віпавайцай усяго нашага гора, усёй нашай гістарычнай пакуты» афіцыйна вітаюць Пілсудскага «як прыяцеля і збаўцу беларускага народу ад заняпаду» і ад імя менскіх беларускіх нацыяналістычных арганізацый і Беларускай Рады Віленшчыны і Гарадзеншчыны просяць у яго дазволу на арганізацыю беларускіх вайсковых часьцей у польскай арміі пад польскім камандваньнем, падкрэсьліваючы, што «толькі ў цесной сувязі з маладой польскай дзяржавай, толькі ў супольнай працы, будаўніцтве і барацьбе з супольнымі ворагамі, усходнімі захватнікамі, пагражаючых нашаму існаваньню мы хопім да сваёй канчатковай мэты: адбудаваньня Беларусі...».

Беларуская контр-рэвалюцыя, усе не палітычныя партыі старанна поўзалі перад белым арлом імпэрыялізму і над яго пратэктаратам вялі жорстокае ўзброенае змаганьне супроць працоўных Беларусі.

З апублікаваных дакументаў, рамі нападу на Савецкую Беларусь банд Булак-Балаховіча. Гэты белагвардзейскі генэрал быў і застаецца гэроем беларускага нацыянал-дэмакратызму. Аб гэтым бандыце, беларускія нацыянал-дэмакраты пісалі, між іншым, так: ...«Атаман добраахвотніцкага народнага атраду генэрал Булак-Балаховіч аказаўся ня толькі ні палякам, ні літвінам, аказаўся ня толькі самым сапраўдным беларусам, але апрача гэтага ён яшчэ зусім сьвядомы ў беларускіх пытаньнях грамадзянін, добра ведае беларускую літаратуру і мову і нават сам піша вершы пабеларуску...». Уступленьне на службу ў армію БНР генэрала Булак-Балаховіча суправаджалася наступнай яго заявай на імя старшыні «Рады народных міністраў БНР»... «Зьяўляючыся грамадзянінам Беларускай Народнай Рэспублікі, лічу патрэбным, каб маё войска было скарыстана для абароны цэльнасьці і недзялімасьці маёй бацькаўшчыны, а таму прапаную майму ўраду залічыць мяне і мой атрад на беларускую службу. Генэрал-маёр Булак-Балаховіч»...

Працоўныя масы Савецкай Беларусі цьвёрда памятаюць крывавыя ўчынкі белагвардзейскіх банд Балаховіча. Шматлікія факты аб жорсткіх расправах Балаховіча над рабочымі і сялянамі захваченых вёсак, мястэчак і гарадоў і дагэтуль жывуць у памяці ўсіх працоўных. Па гэтых фактах нядаўняга мінулага са змаганьня працоўных БССР за савецкую ўладу, супроць польскіх акупантаў, супроць балаховіцкіх налётаў, можна судзіць і прадстаўляць аб тым, **што зараз рыхтавалі і рыхтуюць працоўным БССР беларускія нацыянал-дэмакраты, беларуская контр-рэвалюцыя па той і гэты бок мяжы.** У плянах змаганьня беларускай контр-рэвалюцыі—крывавы генэрал Булак-Балаховіч і зараз зьяўляецца «гэроем» для распраў з працоўнымі Савецкай Беларусі. Ня трэба-ж забываць, што Булак-Балаховіч сёньня знаходзіцца пад асобнай, любоўнай апекай польскага фашызму, што ён сустракаецца з выдатнейшымі прадстаўнікамі пануючай у Польшчы — фашысцкай дыктатуры. Ня трэба забываць, што мізэрныя рэшткі балаховіцкіх банд прытаіліся на той бок савецкай мяжы і зьяўляюцца тымі кадрамі, якія гатовы па загаду сваіх гаспадароў кінуцца на савецкі край. Калі ны ўспамінаем зараз мінулае, зьвязанае з роляю беларускіх нацыянал-дэмакратаў у справе арганізацыі ўзброеных нападаў на Савецкую Беларусь, мы гэта робім для таго, каб падкрэсьліць з усёй сілай, што **сучаснае** беларускага нацыянал-дэмакратызму — **гэта ўпартая работа над падрыхтоўкай узброенага змаганьня супроць працоўных Савецкай Беларусі.** Пад маскай іжлывых заяў аб гатоўнасьці служыць савецкай уладзе хаваюся і хаваецца крывавы твар злоснага нацыяналізму, крок за крокам працаваўшага **над зрывам сацыялістычнага будаўніцтва і падрыхтоўкай новага ўзброенага змаганьня супроць пралетарскай дыктатуры, новых, накшталт балаховіцкіх, налётаў і ваенных авантур.**

У гэтай сваёй злачыннай контр-рэвалюцыйнай рабоце нацыянал-дэмакраты ў БССР зьяўляюцца агентурай польскага фашызму і саюзьнікам заходня-беларускага нацыянал-фашызму. Гэта мы ня раз падкрэсьлівалі ў сваім змаганьні супроць беларускага нацыянал-дэмакратызму, і зараз мы адзначаем **зусім відавочную палітычную і арганізацыйную сувязь нацыянал-дэмакратаў з беларускімі нацыянал-фашыстымі і польскімі імпэрыялістымі.**

Гісторыя і ўсё мінулае беларускага нацыяналізму, напоўненае актыўным змаганьнем за зьвяржэньне савецкай улады, аб'яднае і заходня-беларускую і тутэйшую частку нацыяналістычнай контр-рэвалюцыі. У свой час сёньнішнія правадыры заходня-беларускага нацыянал-фашызму і правадыры і ідэалёгі беларускага нацыянал-дэмакратызму з БССР **у адзіных радох** вялі агульную работу і змаганьне супроць рабочых і сялян, супроць БССР, супроць рэвалюцыі. Але гэтыя абедзьве часткі беларускай контр-рэвалюцыі **аб'яднае ня толькі мінулае, іх аб'яднае адзінства мэт, адзінства праграмы ў цяперашнім змаганьні супроць пралетарскай дыктатуры, супроць БССР.**

Толькі нацыянал-апартуністыя ці безнадзейныя мяшчанскія тупіцы могуць лічыць выпадковым—супаданьне паміж палітычнымі лёзунгамі і выступленьнямі Луцкевіча і мясцовых нацдэмаў, выпадковым — тое чульлівае адзінства, якое злучае луцкевіцкіх нацыянал-фашыстых і нацдэмаў у БССР — абаронцаў хутарское гаспадаркі, абаронцаў арыентацыі на Захад. Гутарка ідзе аб адзінай палітычнай праграме, адзіных імкненьнях і мэтах.

Ня лішнім будзе таму, калі мы зараз падамо некалькі вытрымак з **апошніх выступленьняў і дакумантаў** беларускіх нацыянал-фашыстых, якія (дакументы) праліваюць яскравае сьвятло на іх контр-рэвалюцыйную, фашысцкую, антысавецкую існасьць. Заходня-беларускі нацыянал-фашызм — ідэалёгія беларускай буржуазіі і кулацтва, пад кіраўніцтвам польскага фашызму зусім адкрыта ставіць цэлямі і ініцыятарамі самага разьюшанага цкаваньня Савецкай Беларусі. Выходзячая газэта беларускіх нацыянал-фашыстых «Наперад» з нумару ў нумар аблівае БССР і камуністычную партыю цэбрамі гнуснай хлусьні і паклёпу. Адначасова, нацыянал-фашыстыя вядуць самае актыўнае і жорсткае змаганьне супроць рэвалюцыйнага руху працоўных Заходняй Беларусі. Яны прабуюць упесьці разлажэньне ў рады рэвалюцыйна-вызваленчага руху, яны адкрыта выступаюць у якасьці паліцэйскіх агентаў польскага фашызму і правакатараў. Уся гэта контр-рэвалюцыйная, фашысцкая дзейнасьць прыкрываецца гутаркамі і балбатнёй аб «незалежнасьці», аб «адзінстве інтарэсаў усяго беларускага народу» і г. д., і г. д. Але шырокія працоўныя масы Заходняй Беларусі добра назнаюць за гэтымі фразамі і гэтай балбатнёй фашысцкую і паліцэйскую сутнасьць зуцкевіцкіх бандытаў і вядуць супроць іх самае жорсткае і непрымірымае змаганьне.

Зьвернемся да дакумантаў! Перад намі ляжыць нумар газэты «Наперад» **ад 21 чэрвеня 1930 г.,** які спэцыяльна прысьвечаны прыезду ў Вільню і па Віленшчыну польскага прэзыдэнта Масьціцкага. Гэты нумар газэты перапоўнены цэлым радам «дэкларацыйных» заяў Луцкевіча на адрасе «высокага госьця». У гэтых дакумантах — уся «праграма дзеяньняў» беларускага нацыянал-фашызму. У перадавым артыкуле «Слова праўды высокаму госьцю» Луцкевіч перш за ўсё сьпяшаецца заявіць, што «беларускі народ» ...«гатоў заўсёды цьвяроза лічыцца ці мірыцца з рэальнымі варункамі бягучай сучаснасьці, **гатоў нават цаніць і берагчы ўсялякі існуючы лад,** наколькі, зразумела, ён дае народу магчымасьць духоўнага разьвіцьця і спакойнай творчай працы»...

Відома, пад тэрмінам «беларускі народ» трэба разумець беларускую буржуазію, кулака, усю нацыянал-фашысцкую контр-рэвалюцыю, якая ў сваёй вернападданьніцкай вернасьці адкрыта абяцае «цаніць і берагчы» фашысцкае панаваньне на Заходняй Беларусі. Луцкевіч, гэты гэрой і духоўны бацька беларускіх нацыянал-дэмакратаў з БССР, расьпінаецца сёньня, так як ён гэта рабіў у свой час перад Вільгельмам II, аб гатоўнасьці верай і праўдай служыць новай «вялікасьці» — польскаму імпэрыялізму. Дзеля таго, каб пусьціць пыл у вочы працоўным масам, ашуканць і тым самым лепш прадаць іх, Луцкевіч у гэтым артыкуле называе фашысцкую дыктатуру ў Польшчы «дэмакратыяй», з якой можна жыць у міры і спакоі. Луцкевіч піша: ...«Цяпер у Польшчы пануюць, маюць дзяржаўную ўладу і сілу якраз польскія дэмакраты. Дык яны і павінны распачаць шчыра і паступова рэалізацыю тых лёзунгаў, якія зьяўляюцца аснoўным зьместам іх палітычнага сьмыслу веры...».

І іменна з гэтымі «польскімі дэмакратамі» — фашысцкай дыктатурай, якая бязьлітасна распраўляецца з найменшым праяўленьнем нацыянальна-вызваленчага руху працоўных Заходняй Беларусі, ідзе ў цесным саюзе—беларуская контр-рэвалюцыя. І іменна на іх ставіць сваю стаўку і беларускі нацыянал-дэмакратызм з БССР. «Горача вітаючы» прэзыдэнта Масьціцкага, Луцкевіч у гэтым-жа артыкуле рассыпаецца перад ім з наступнымі словамі: «... Прэзыдэнт польскай рэспублікі... упершыню зьяўляецца ў наш край **не са словамі заваяваньня на вусках, але ян госьць паміж іншым і нашага народу,** асабіста зацікавіўшыся нашым беларускім жыцьцём і працай, і нашай беларускай мінуўшчынай. Мы можам толькі пажадаць — і яму і сабе — каб ён сапраўды — не на словах, а на дзеле, — зьвязаў сваё імя ў гісторыі з радучым, шчырым і цьвёрдым паваротам у польскай палітыцы адносна нашага краю і нашага шматпакутнага народу...».

У мэмарыяле, зьвернутым да прэзыдэнта—Луцкевіч, Астроўскі, Станкевіч і інш., — «патрабаваньні» свае зводзяць да наступнага агульнага пункту: ...«У мэтах абагуленьня праграмы па беларускаму пытаньню ўважаем за неабходнае **санкцэнтраваньне адміністрацыйнае ўлады на абшарах усяе Заходняе Беларусі і выдзяленьне ваяводзтваў Віленскага, Навагрудзкага, Палескага і часьці Беластоцкага ў адну адміністрацыйную адзінку».** Вось праграма беларускага нацыянал-фашызму, якая зводзіцца да вылучэньня чатырох заходня-беларускіх ваяводзтваў у адну адміністрацыйную адзінку — вядома з тэй-жа фашысцкай акупацыйнай улады, вядома, з тым-жа і **яшчэ больш жорсткім, масавым белым тэрорам,** з тымі-ж перапоўненымі турмамі, з тымі-ж дэфэнзывай і жандармэрыяй. Вось праграма, на якой можна судзіць і аб «канчатковых» мэтах беларускага нацыянал-дэмакратызму, **які марыць аб тым, каб і Савецкую Беларусь ператварыць у адну з адміністрацыйных адзінак фашысцкай, імпэрыялістычнай Польшчы.**

Мы ўжо гаварылі вышэй, што беларускі нацыянал-фашызм зьяўляецца сілай, якая прымае непасрэдны ўдзел у падрыхтоўцы вайны супроць Савецкай Беларусі. У гэтым-жа нумары газэты, мы маем зусім ня двузначныя словы аб фашысцкіх палітычным аглядзе, спыняючыся на апошніх падзеях, нацыянал-фашысцкі «Наперад» заяўляе: ...«На ўсходніх рубяжох сучаснай Польшчы вялізарная большасьць насяленьня ня польская. **Дык і ўся справа абароны гэтых граніц прымае выразна і прынцыпова палітычны характар.** Тое, што робіцца за чырвоным кардонам,—піша газэта,—дае яшчэ раз—можа ўжо ў апошні раз—**нячувана памысныя магчымасьці для польскай палітыкі...** Ці выкарыстаюць гэтую нячувана карысную, як кажуць кан'юнктуру, кіраўнікі сучаснай Польшчы, дзеля вырашэньня асноўнай задачы польскай усходняй палітыкі—поўнага паразуменьня з сваімі тэрытарыяльнымі меншасьцямі, гэта ня толькі справа іх дзяржаўнага розуму, **але можа і пытаньне усёй будучыні Польшчы, як незалежнай дзяржавы»...**

У гэтай цытаце, якую мы падалі з газэты, з выключнай шчырасьцю выкладаецца праграма беларускага нацыянал-фашызму, які яўна заклікае польскіх імпэрыялістых да **вагнага** вырашэньня «усходняй праблемы». Беларускія нацыянал-фашыстыя проста заяўляюць, **што ў пытаньнях абароны меж фашысцкай Польшчы, яны адкрыта стаяць на пазыцыях польскага фашызму.**

Будзе зусім правільна, калі мы па гэтых праграмных заявах Луцкевіча будзем судзіць і аб палітычнай праграме беларускага нацыянал-дэмакратызму тут. Беларускі нацыянал-дэмакратызм, вядучы змаганьне супроць пралетарскай дыктатуры ў БССР таксама, як і Луцкевіч **ставіць стаўку на замежную інтэрвэнцыю, кажучы ня—на інтэрвэнцыю польскага імпэрыялізму.** Уся контр-рэвалюцыйная дзейнасьць беларускіх нацыянал-дэмакратаў паднадаткавана падрыхтоўцы ажыцьцяўленьня гэтай галоўнай і цэнтральнай задачы. **Змаганьне з савецкай уладаю, змаганьне за разьвязваньне капіталістычных сіл у краі, змаганьне за хутарскія шляхі разьвіцьця сельскае гаспадаркі, за буржуазную беларускую культуру, імкненьне арганізацыйна скалаціць контр-рэвалюцыйныя нацыяналістычныя сілы**—усё гэта ідзе па адной лініі—на лініі актыўнай падрыхтоўкі да замежнай інтэрвэнцыі. Луцкевіч адкрыта гаворыць пра тое, аб чым не маглі і не адважыліся **адкрыта** заяўляць беларускія нацыянал-дэмакраты ў БССР. І тых і другіх **і палітычна і арганізацыйна,** аб'яднае адзінства клясавых мэт—зьвяржэньне пралетарскай дыктатуры, змаганьне за ператварэньне Савецкай Беларусі ў калёніяльны край польскага імпэрыялізму.

І тыя і другія ідуць у цесным саюзе з інтэрвэнтамі, і тыя і другія актыўна змагаюцца за падрыхтоўку вайны супроць краіны саветаў.

Сьвядомае шкодніцтва, сабатаж, арганізаваныя імкненьні сарваць наша сацыялістычнае будаўніцтва, пляннавая, настойлівая і ўпартая работа над зьбіраньнем усіх жывых сіл контр-рэвалюцыі—стаўка на інтэрвэнцыю, на антысавецкую вайну міжнародных і польскіх імпэрыялістых, саюз з заходня-беларускім нацыянал-фашызмам і польскім фашызмам—вось твар, вось існасьць беларускай контр-рэвалюцыі!

Наша **разгорнутае сацыялістычнае наступленьне** сустракае шалёнае супраціўленьне клясавага ворага. На асновах суцэльнай калектывізацыі, шырокія працоўныя масы пад кіраўніцтвам кампартыі, ажыцьцяўляюць палітыку ліквідацыі апошняе капіталістычнае клясы—кулацтва. Гэтая кляса, як і капіталістычныя элемэнты гораду, ня хочуць добраахвотна зыйсьці са сцэны гісторыі. Яны вядуць шалёнае змаганьне супроць пралетарскай дыктатуры. Вядуць шалёнае змаганьне супроць пралетарскай дыктатуры і палітычныя ідэалёгі капіталістычных элемэнтаў гораду і вёскі—беларускія нацыянал-дэмакраты. XVI зьезд УсеКП(б) правільна характарызаваў мясцовы нацыяналізм, як тую сілу, **якая іграе на руку інтэрвэнтам.** І з гісторыі, і з суровай сучаснасьці абвостранага клясавага змаганьня мы бачым, як беларуская контр-рэвалюцыя не гальбуючы сродкамі і формамі, вядзе змаганьне ў саюзе і пры дапамозе замежнага капіталу супроць працоўных, супроць савецкай улады. Пралетарская дыктатура жорстка распраўляецца з клясавым ворагам. **Наша партыя, ажыцьцяўляючы ленінскую нацыянальную палітыку, з посьпехам мабілізоўвала і будзе мабілізоўваць шырокія працоўныя масы Савецкай Беларусі на змаганьне з клясавым ворагам і яго контр-рэвалюцыйнымі прадстаўнікамі і ідэалёгамі. Уся палітыка нашай партыі, у тым ліку і яе нацыянальная палітыка апіраецца на магутнае падтрыманьне шырокіх працоўных мас.**

Шырокія масы працоўнай інтэлігенцыі таксама ідуць за нашай партыяй, таксама падтрымліваюць палітыку партыі на разгорнутае сацыялістычнае наступленьне, таксама падтрымліваюць і нашу нацыянальную палітыку. Перад хісткімі адзінкамі, якія быць можа яшчэ зусім нядаўна верылі ў «незалежніцкае» мінулае розных «гэрояў» БНР, якія ідэалізавалі гэта мінулае рубам стаіць пытаньне —або—або. І апублікаваныя дакументы з мінулага і ўся контр-рэвалюцыйная работа ў сучасным зрывае іжлывую маску міралюбівых фраз з нацыянал-дэмакратаў. Ніякіх хістаньняў у адносінах да контр-рэвалюцыйных нацыянал-дэмакратаў быць ня можа. Або з пралетарскай дыктатурай і тады разам з ёю, разам з шырокімі працоўнымі масамі, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі **трэба актыўна змагацца** з клясавым ворагам, з контр-рэвалюцыяй, або—хістаньні і тады простай дарогай у абдымкі контр-рэвалюцыйнага нацыяналізму, які ставіць стаўку на зрыў сацыялістычнага будаўніцтва, на зрыў будаўніцтва і разьвіцьця беларускай пралетарскай культуры, на зьнішчэньне Савецкай Сацыялістычнай Беларусі. Вось такая суровая лёгіка абвостранага клясавага змаганьня. **Ніякай сярэдзіны тут быць ня можа.** Так, і толькі так, можа і павінна стаяць пытаньне перад кожным сумленным працоўным інтэлігентам, які шчыра хоча працаваць разам з працоўнымі масамі пад будаўніцтвам новага сацыялістычнага жыцьця, пад будаўніцтвам, разьвіцьцём і ўмацаваньнем Савецкай Сацыялістычнай Беларусі **ў дружнай і непарыўнай сям'і народаў усяго Савецкага Саюзу.**

Вядучы бязьлітаснае змаганьне супроць саюзьнікаў інтэрвэнцыі—контр-рэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму, наша партыя будзе і надалей з усёй непрымірымасьцю, рашучасьцю і пасьлядоўнасьцю **весьці змаганьне з яго агентурай унутры партыі—нацыянал-апартуністымі. Наша баявая задача—ачысьціць рады партыі ад нацыянал-амартуністых усіх колераў і адценьняў, якія яшчэ засталіся ў ёй, не паслабляць змаганьня з праяўленьнямі нацыянал-апартунізму ў тэорыі і практыцы, даваць бязьлітасны, адпор усякім прымірэнчым адносінам да нацыянал-апартуністых.**

Перадвыбарчая кампанія кампартыі Нямеччыны

праходзіць пад знакам шпаркага росту яе ўплыву

Абраны чырвоныя выбарчыя камісіі

ВЭРЛІН, 3. Грандыёзныя першажніўпеньскія дэманстрацыі ва ўсіх раёнах Нямеччыны паслужылі таксама на карысьць разьвіцьця перадвыбарнай кампаніі кампартыі ў сувязі з надыходзячымі ў верасьні выбарамі ў рэйхстаг. На сотнях прадпрыемстваў рабочымі ўжо **абраны чырвоныя выбарчыя камісіі.** На шматлікіх фабрыках і заводах **рабочыя парашылі адлічыць ў фонд перадвыбарнай кампаніі кампартыі аднагадзінны заработак.** Рэвалюцыйныя фізкультурнікі, члены антыфашысцкіх саюзаў і арганізацыі рабочай самаабароны стварылі ў радзе гарадоў мясцовыя групы садзейнасьці чырвоным выбарным сьпісам.

Гарадзкія пралетары « камуністыя выяжджаюць у вёску для дапамогі сельскім ячэйкам, для пашырэньня ўплыву кампартыі сярод сялянскай беднаты і батракоў і для стварэньня новых ячэек кампартыі. Работа кампартыі ў вёсцы асабліва моцна ў Рэйнскай вобласьці, а таксама ў Цюрынгіі і Саксоніі.

Перадвыбарная кампанія кампартыі сустракае моцную супрацьдзейнасьць з боку ўлад і паліцыі, на чале якіх у многіх гарадох знаходзяцца сацыял-дэмакраты. Камуністычныя агітатары, а таксама перадвыбарчыя сходы, якія скліканыя кампартыяй, падвяргаюцца

Выбіраць камуністычных дэпутатаў

БЭРЛІН, 3. Камфракцыя нямецкага рэйхстагу склікала прадстаўнікоў фабрычна-заводзкіх камітэтаў буйнейшых бэрлінскіх прадпрыемстваў на сход у будынку рэйхстагу для інфармацыі рабочых аб варожай рабочай клясе падатковай палітыцы кабінэту Брунінга. На сходзе прысутнічала 160 прадстаўнікоў фабрычна-заводзкіх камітэтаў. Усе прысутныя — члены прафэсіянальных саюзаў. Значная частка — беспартыйныя. Даклады выступаўшых камуністычных дэпутатаў былі спатканы шумным ухваленьнем. Сход пастанавіў **мабілізаваць увагу рабочых мас на надыходзячых выбарах з тым, каб правесьці ў рэйхстаг камуністычных дэпутатаў.**

Паход капіталістых на зарплату

БЭРЛІН, 3. У сілезкай металяпрамысловасьці прадпрыемцы, з мэтай дабіцца зьніжэньня зарплаты на 10 проц., адмовіліся аднавіць у другі раз тарыфны дагавор, тэрмін якога канчаецца 1-га верасьня. У мэталяпрамысловасьці Саксоніі прадпрыемцы таксама адмаўляюцца аднавіць ужо скончаны тарыфны дагавор. У дрэваапрацоўчай прамысловасьці прадпрыемцы імкнуцца зьніжыць зарплату ад 10 да 20 проц. На 45 дапаможных прадпрыемствах заводу Крупа для 10.000 з 15.000 занятых на іх рабочых увядзен скарочан-

ДА ДНЯ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ

ПРАВЕРЫМ РАБОТУ УДАРНЫХ БРЫГАД

Сход рабочых і служачых **Менхладабойні і кішачнага заводу,** заслухаўшы выклік рабочых ленінградзкага заводу «Пралетары» аб правядзеньні дня індустрыялізацыі, палкам падтрымлівае выклік і абавязуецца працаваць у карысьць фонду індустрыялізацыі 8-га жніўня. Рабочыя абяцаюць у гэты дзень выпусьціць больш прадукцыі, чым звычайна, а таксама лепшую прадукцыю.

У гэты дзень мы праверым работу нашых ударных брыгад, ход сацыялістычнага спаборніцтва і давядзеньне прамфінпляну да кожнага рабочага.

У сваю чаргу выклікаем адпрацаваць дзень індустрыялізацыі ўсе харчовыя прадпрыемствы Беларусі ў галоўную кантору Белмяса.

Старшыня заўкому **Кацнэльсон.**

РЫХТУЕМСЯ ДА СУБОТНІКА

4-га жніўня ў ВАГОННЫХ МАЙСТЭРНЯХ МБВ чыг. адбыўся мітынг аб другім дні індустрыялізацыі.

Рабочыя аднагалосна пастанавілі правесьці ў пэрыяд ад 6 да 16-га жніўня дзень індустрыялізацыі. Увесь гэты пэрыяд павінен зьявіцца генэральным аглядам выкананьня транфінпляну, ходу разгортваньня сацспабор ніцтва і ўдарніцтва. Апрача таго рабочыя майстэрань пастанавілі правесьці ў гэты час суботнік у нарысьць фонду індустрыялізацыі.

У сувязі з бесьперапыннай працай майстэрань кожны рабочы будзе працаваць у свой выхадны дзень. Абрана камісія для кіраўніцтва гэтай справай.

Мітынг прыняў выклік работніц малога рамонту вагонаў МБВ чыг. і выклікае заводы «КАМУНАР» і «БАЛЬШАВІК» пасьледваць іх прыкладу.

Ш.

Прымаем заклік ленінградзкіх рабочых

Заслухаўшы інфармацыю аб выкліку ленінградзкіх рабочых па правядзеньні дня індустрыялізацыі рабочыя, служачыя і тэхнічны пэрсанал заводу «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» пастанаўляюць прыняць гэты выклік.

У сувязі з гэтым усе рабочыя, служачыя і тэхнічны пэрсанал заводу «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» бяруць на сябе абавязацельства ПРАЦАВАЦЬ 6-ГА ЖНІЎНЯ НА КАРЫСЬЦЬ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ КРАІНЫ.

Адначасова мы выклікаем пасьледваць нашаму прыкладу наступныя прадпрыемствы: ХЛЕБАЗАВОД, броварны завод «БЕЛАРУСЬ» і фабрыку цукерак «КАМУНАРКА».

У Польшчы ўсё больш паглыбляецца гаспадарчы крызіс

Польскі фашызм інтэнсыўна рыхтуецца да антысавецкай вайны

Па нахіленай роўніцы

ВАРШАВА, 4. Апошнія даныя афіцыйнай «Гаспадарчай Кан'юнктуры» гавораць аб далейшым заняпадзе прамысловай вытворчасьці. Напрыклад, у гутах вытворчасьць зьменшылася ў параўнасьці з адпаведным пэрыядам мінулага году на 32,2 проц., у вальцах —на 43,1 проц., вытворчасьць сталі—на 30 проц. Запас валюты польскага эмісійнага банку, які зьяўляецца пакрыцьцём для банкнотаў, паменшыўся з студзеня гэтага году да 10-га чэрвеня на 152 мільёны злотых.

У працягу 5 месяцаў запас валюты зьменшыўся на 225 млн. злотых. Адначасова на працягу гэтага пэрыяду грашовы зварот у краіне зьменшыўся на 80 млн. злотых, інакш гаворачы польскі эмісійны банк вядзе палітыку дэфляцыі. Апрача таго, пры значным скарачэньні экспарту і імпарту гандлёвы баланс у апошні час стаў зноў пасыўным.

У сельскай гаспадарцы становішча ня менш сур'ёзнае. Паводле даных «Кан'юнктуры», трэба чакаць, што ў бліжэйшыя месяцы будзе павышэньне цэн па збожжа. Дрэнна з будаўнічымі прадуктамі. Асабліва цяжка з вывазам бэкону, таксама збыт сьвіней значна паменшыўся. Урад лезе вон са скуры, каб прыйсьці на дапамогу буйным памешчыкам. Польскі міністар зямляробства абяцаў памешчыкам, што ўрад будзе ўжываць усялякія сродкі, каб палепшыць становішча. Міністар зямляробства прапанаваў памешчыкам, каб яны ўстрымаліся да новага году з выкідваньнем на рынак збожжавай прадукцыі, і часова бралі крэдыты пад заклад збожжа, якія ўрад гарантуе буйным зямельным уласьнікам.

У той-жа час, калі фашысцкі ўрад бярэ пад свае апякунчыя крылышкі «бедных» памешчыкаў, — у міністэрстве праці абдываюцца нарады па пытаньні «зьмены сацыяльнага заканадаўства». Увесь пяжар крызісу фашызм хоча перакінуць на плечы рабочых мас.

Жырардаў--могілкі прамысловасьці

ВАРШАВА, 4. Натавіцкая «Палёнія» піша:

«Доўгія годы Жырардаў быў гордасьцю польскай прамысловасьці. 30.000 людзей жыла з вялізарнай прадзільні, а жырардаўскія прадукты былі вядомы па ўсім сьвеце. Сёньня горад прымушаны жыць з фондаў беспрацоўя, а галеча зазірае ўсім у вочы. Жырардаў зьяўляецца сёньня сымбалям — тырчаць коміны, руіны польскай прамысловасьці, як калёны помнікаў на гэтых вялікіх могілках імя міністра Квяткоўскага.

Калі сам міністар вернецца з-заграніцы было-б добра, каб ён выйшаў на станцыю ў Жырардаве і ўзрадаваў галодных рабочых сваімі ордэнамі. Ён-бы мог знайсьці такі прыём, што на гэтых вялікіх могілках яму-б не адмовілі ў ганаровым месцы.

Далейшыя візыты „далікатнасьці"

ВАРШАВА, 4. У Эстоніі вядзецца энэргічная падрыхтоўка ў сувязі з прыездам прэзыдэнта Масьціцкага. 11-га жніўня там адбудзецца вайсковы парад, які ся слоў афіцыйнай эстонскай газэты,—будзе найбольшым з тых, якія адбыліся ў Рэвэлі. Талінскі гарнізон і фашысцкія арганізацыі будуць палкам прымаць удзел у параадзе.

Гэтымі днямі ў Польшчу прыязджае французкі генэрал дэ-Бэль і будзе прымаць удзел у манэўрах, якія распачынаюцца ў Польшчы.

Зачыняюцца тэкстыльныя фабрыкі, але ўсё больш узрастаюць ваенныя заводы

БЭРЛІН, 3. «Фосіш Нэйтунг» друкуе артыкул свайго карэспандэнта Мюлера, які знаходзіцца ў доўгай паездцы па Польшчы. Гэты артыкул паказвае, што захаваньне польскай дзяржавы ў тым выглядзе, як яна штучна створана Варсальскім дагаворам, патрабуе наяўнасьці вялізарных узброеных сіл. Мюлер піша: «Кожнае палітычнае пытаньне разглядаецца і вырашаецца сёньня ў Польшчы з ваеннага пункту погляду афіцэрамі, у руках якіх знаходзяцца важнейшыя міністэрскія партфэлі і кіраўніцтва народнай гаспадаркай. Карэспандэнт лічыць, што гэта з прычыны унутранога і міжнароднага станов

З ГАБІНЭТАЎ—У ЦЭХІ І БРЫГАДЫ

Кантрольныя лічбы трэцяга году пяцігодкі на абгаварэньне шырокіх рабочых мас

Арганізуем „сустрэчны прамфінплян"—вышэйшую форму сацспаборніцтва

ПРАФСАЮЗЫ Ў БАКУ АД ВАЖНЕЙШАЙ ПАЛІТЫЧНАЙ КАМПАНІІ

Трэці год—рашаючы год пяцігодкі

У сваёй адозве да ўсіх гаспадарчых і прафесыянальных арганізацый ЦСПСБ і ВСНГ адзначаюць, што 1930-31 гаспадарчы год зьяўляецца рашаючым для выкананьня пяцігодкі і будзе мець выключнае значэньне ў справе індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сельскай гаспадаркі. І сапраўды, кантрольныя лічбы рэспубліканскай прамысловасьці на 1930-31 год, зацьверджаныя прэзыдыумам ВСНГБ, намячаюць **яшчэ большае ўзмацненьне тэмпаў індустрыялізацыі і работы нашай прамысловасьці.** Выпуск валавой прадукцыі запраектаваны ў 616.100 тыс. рублёў супроць 280.400 тыс. рубл., прадугледжаных трэцім годам пяцігодкі, што дае рост супроць бягучага году **на 114,4 проц.** Колькасьць рабочых маркуецца давесьці **да 64.600 чалавек,** у той час, як паводле пяцігодкі памячалася 42.100 чалавек. Апошняя лічба ўжо **ў бягучым гаспадарчым годзе перавышана на 100 чалавек.**

Сабекошт прадукцыі павінен быць зьніжан на 11 проц. І прэзыдыум ВСНГБ рашуча ставіць пытаньне аб тым, каб гэта заданьне было абавязковa выканана, бо невыкананьне дырэктывы на зьніжэньні сабекошту на працягу апошніх год стварыла значныя цяжкасьці на шляху далейшага разьвіцьця нашай прамысловасьці, якія павінны быць абапялкова пераможаны на працягу трэцяга году пяцігодкі.

Асабліва буйны рост намячаецца ў галіне капітальнага будаўніцтва. Так, калі плянам пяцігодкі прадугледжвалася затраціць у трэцім годзе пяцігодкі 38.600 тыс. руб., дык кантрольнымі лічбамі на 1930-31 год намечана затраціць **151.300 тысяч рублёў.**

На жыльлёвае і камунальнае будаўніцтва, на сталоўкі, клюбы, ясьлі і інш. бытавыя ўстановы ў будучым годзе маркуецца затраціць вельмі значную суму **ў 25.354 тысячы рублёў,** якая ў некалькі разоў перавышае выдаткі на гэту мэту ў бягучым годзе.

У асноўным капітальныя работы пойдуць на лініі тарфяной, мэталяапрацоўчай, хэмічнай і тэкстыльнай прамысловасьці і вырабу будаўнічых матар'ялаў.

1930-31 год, у зязязку з пускам электрастанцыі **імя Сталіна,** дае буйны рост энэргетычных ресурсаў: з 25.800 кілёват да 62.700 кілёват і павялічвае выраб энэргіі з 76.700 тыс. кілёват-гадзін да 174.500 тыс. кілёват-гадзін, што забясьпечвае яшчэ больш хуткія тэмпы індустрыялізацыі БССР.

Улічваючы практыку работы прамысловасьці ў мінулыя гады і наяўнасьць раду тэхнічных недахопаў, якія ў значнай меры перашкаджалі поўнаму выкананьню колькасных і асабліва якасных паказальнікаў, прэзыдыум ВСНГБ для забясьпячэньня выкананьня задач, што стаяць перад прамысловасьцю ў будучым годзе, прапануе прыняць самыя яшчэ меры **для найбольшага скарыстаньня асноўнага капіталу.** Павінна быць павялічана нагрузка абсталяваньня, уведзены новыя зьмены, скарочаны прастоі, узмоцнена тэхнічнае абсталяваньне і г. д.

Побач з заданьнем зьнізіць сабекошт на 11 проц. ставіцца цэнтральная задача — **палепшыць якасьць прадукцыі.** Прэзыдыум ВСНГ у сваёй настанове падкрэсьліў, што пагоршаньне якасьці прадукцыі будзе расцэньвацца як невыкананьне пляну нават пры наяўнасьці здавальняючых вынікаў па іншых паказальніках.

Заработная плата павінна быць павялічана намінальна на 8,1 проц. пры рэальным росьце зарплаты на 15 проц.

Вось у кароткіх і агульных рысах плян работы трэцяга году пяцігодкі.

Чаму патрэбна масавая прапрацоўка кантрольных лічбаў

Зразумела, выкананьне гэтага пляну патрабуе **дружнай і напружанай работы ўсяе рабочае клясы і тэхнічнага персаналу і поўнай увязкі работы ва ўсіх стадыях прапрацоўкі прамфінпляну.** Неабходна, каб кожны цэх, агрэгат і нават варштат ведаў дасканала сваю праграму работы на будучы год.

Адозва ЦСПСБ і ВСНГ адзначае, што для ажыцьцяўленьня гэтае работы нельга абмежавацца, як у мінулым годзе, толькі заслухоўваньнем дакладаў дырэктараў аб прамфінпляне, **без папярэдняй прапрацоўкі самімі рабочымі ўсіх асноўных момантаў па цэхах і агрэгатах, бо невыстарчальная прапрацоўка прамфінпляну зьяўляецца адной з асноўных прычын невыкананьня прамфінпляну.** Прэзыдыум ЦСПСБ і ВСНГБ прапануюць **неадкладна** арганізаваць у кожным цэху рабочую брыгаду, або часовую кантрольную камісію, якая занялася-б разам з адміністрацыйна-тэхнічным персаналам распрацоўкай усіх пытаньняў прамфінпляну. Пры прапрацоўцы прамфінпляну трэба скарыстаць **усе рацыяналізатарскія мерапрыемствы і прапановы рабочых і служачых,** якія былі выяўлены ў часе самаправеркі выкананьня сацспаборніцтва. Для дапамогі і кансультацыі пізавым арганізацыям трэба прыцягнуць добраахвотны актыў інжынэраў, эканамістых і іншых спэцыялістых.

Усе заўвагі і прапановы паасобных брыгад і ЧКК пасьля іх ухваленьня на рабочых сходах павінны быць перададзены адміністрацыі і ЦП саюзаў для ўключэньня ў прамфінпляны.

Уся работа па складаньні прамфінпляну на прадпрыемствах павінна быць скончана **не пазьней 20 жніўня г. г.** Тыя прапановы рабочых, якія чамусьці ня знойдуць адлюстраваньня ў кантрольных лічбах прадпрыемстваў, трэба перадаць у гаспадарчыя аб'яднаньні і ЦП саюзаў, каб апошнія маглі ў далейшым унесьці ў плян зьмены, калі гэта патрэбна будзе пры зацьвярджэньні прамфінпляну.

Улічваючы, што зводныя кантрольныя лічбы на 1930-31 год павінны быць зацьверджаны да пачатку году, уся работа па прапрацоўцы і складаньні кантрольных лічбаў на ўсіх зьвеньнях прамысловасьці павінна быць праведзена ва ўдарным парадку з тым, аднак, каб гэта не адбілася на якасьці прапрацоўкі.

ЦП саюзаў па скончэньні прапрацоўкі прамфінпляну асобных прадпрыемстваў павінны склікаць вытворчыя канфэрэнцыі для абгаварэньня зводных пляноў аб'яднаньня ў тэрмін ад 15 да 20 верасьня

Дырэктыва УсеЦСПС ня выканана

Трэба, аднак, сказаць, што гэта дырэктыва **значна спазьнілася.** Наогул удзел прафсаюзаў і шырокіх рабочых мас у складаньні кантрольных лічбаў на 1930-31 год зьяўляецца **невыстарчальным**

Яшчэ ў пачатку мая была апублікавана пастанова прэзыдыуму УсеЦСПС ад 28 красавіка аб удзеле прафсаюзаў у складаньні кантрольных лічбаў на 1930-31 год. **Гэта пастанова нашымі прафсаюзамі ня выканана.** Прэзыдыум УсеЦСПС прапанаваў усім прафарганізацыям, **не чакаючы атрыманьня лімітаў ад аб'яднаньняў, трэстаў, устаноў і г. д.,** неадкладна прыступіць на прадпрыемствах і ў цэхах да прапрацоўкі прапаноў рабочых, вытворчых нарад і часовых кантрольных камісій, накіраваных на дасягненьні максымальных колькасных і якасных паказальнікаў у вытворчасьці. Тады яшчэ прэзыдыум УсеЦСПС прапанаваў для правядзеньня падрыхтоўчай работы на складаньні кантрольных лічбаў на прадпрыемствах і ў буйных цэхах **арганізаваць работы брыгады або ЧКК,** якія разам з інжынэрна-тэхнічнымі работнікамі павінны былі правесьці гэту работу і падрыхтаваць матар'ял для пастаноўкі пытаньня на вытворчых нарадах, канфэрэнцыях і агульных сходах. Павінны былі быць арганізаваны—добраахвотны актыў з эканамістых, інжынэраў і іншых работнікаў для кансультацыі і дапамогі нізавым арганізацыям у іх плянавай работе і выпрацоўцы больш мэтазгодных мэтадаў збору падрыхтоўчых матар'ялаў для кантрольных лічбаў і аналізу гэтым матар'ялам. Брыгады ў цэхах павінны былі выявіць ступень загрузкі кожнай машыны, магчымасьць лепшага і больш доўгага скарыстаньня абсталяваньня, абслугоўваньня машыны рабочымі адпаведнай кваліфікацыі і г. д. **На падставе гэтай праверкі, рабочая брыгада павінна была прыблізна ўстанавіць, наколькі магчыма павялічыць выпрацоўку гэтай машыны, або дакага агрэгату, якая можа атрымацца эканомія на рабочай сіле, апале, энэргіі і на сыравіне, як гэта адаб'ецца на зьніжэньні сабекошту прадукцыі і г. д.**

Гэта пастанова пізавымі прафарганізацыямі ня выканана, што пазбавіла іх магчымасьці арганізаваць «сустрэчны прамфінплян», як гэта мела месца на некаторых іншых прадпрыемствах Савецкага Саюзу.

Значная частка віны за гэта падае на цэнтральныя праўленьні саюзаў і ЦСПСБ, якія **не арганізавалі праверкі выкананьня пастановы прэзыдыуму УсеЦСПС** і, ня гледзячы на простае паказаньне прэзыдыуму УсеЦСПС, **заспу хоўваць на сваіх пасяджэньнях даклады аб рабоце,** праведзенай данай арганізацыяй у галіне распрацоўкі кантрольных лічбаў на 1930-31 год і аб удзеле ў гэтай працы рабочых мас, **гэту работу не ўвялі ў сыстэму.** А прэзыдыум ЦСПСБ нават не заслухаў ні аднаго дакладу ЦП саюзаў па гэтым пытаньні.

Бяз удзелу мас

Такую ж апоўнага часу на многіх прадпрыемствах як рабочая маса стаіць у баку ад складаньня кантрольных лічбаў на будучы год. Дырэктыва УсеЦСПС аб складаньні цэхавых брыгад для праверкі нагрузкі машын, аб прапрацоўцы прапаноў рабочых, вытворчых нарад і ЧКК, аб стварэньні добраахвотнага актыву з спэцыялістых і г. д. **ня выканана.** Толькі зараз у дырэктыве ЦСПСБ і ВСНГБ, якая пасланa мясцом 25-га ліпеня, мы знаходзім прапанову, аналягічную прапанове УсеЦСПС, аб арганізацыі цэхавых брыгад, ЧКК для распрацоўкі пытаньняў, зьвязаных са складаньнем кантрольных лічбаў і аб скарыстаньні ўсіх рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў і пастаноў рабочых і служачых, якія выяўлены былі ў часе самаправеркі выкананьня сацспаборніцтва. Між тым вакол складаньня кантрольных лічбаў трэба было арганізаваць **асаблівы ўздым ініцыятывы рабочых мас, ударнікаў і спэцыяльны збор рабочых прапаноў, выходзячы з плянавых намётак на будучы год.** Гэта работа і парадзіла «сустрэчны прамфінплян», **аб якім ня чуваць на нашых прадпрыемствах.**

Арганізаваць „сустрэчны прамфінплян"

І цяпер яшчэ ня відаць, каб вакол прапрацоўкі кантрольных лічбаў была створана грамадзкая думка, каб лічбы прамфінпляну на будучы год сталі злабыткам рабочых мас.

Ня выканана яшчэ дырэктыва ВСНГ ад 28 ліпеня аб арганізацыі гаспадарчымі аб'яднаньнямі і трэстамі спэцыяльных камісій у дапамогу прадпрыемствам па складаньні прамфінпляну на 1930-31 год. На думцы ВСНГ у задачы гэтых камісій павінна ўваходзіць не абсьледаньне прадпрыемства, а **жывая тэхнічна-эканамічная дапамога нізавым работнікам у справе прапрацоўкі асноўных паказальнікаў прамфінпляну.** Між тым, толькі 3 аб'яднаньні (швэйнае, папяровае і хэмічнае) вылучылі камісіі **з 3-х чалавек** кожная. Іншыя— гаспадарчыя органы пакуль што з гэтым не сьпяшаюцца.

Дырэктыву ЦСПСБ і ВСНГ, пасланую ўсім ЦП саюзаў 25 ліпеня, многія прафработнікі нават **ня чыталі.** Гэта цалкам пацьвердзіла праверка, зробленая супрацоўнікам «Зьвязды». У Белкамітэце саюзу мэталістых ліст ЦСПСБ і ВСНГ быў атрыманы 26 ліпеня, але да 3 жніўня ніхто яго нават не прачытаў. У ЦП саюзу швэйнікаў таксама аб гэтым лісьце нічога ня ведаюць. І г. д.

Цікава адзначыць, што некаторыя работнікі ЦП саюзаў нават ня чулі аб «сустрэчным прамфінпляне», ня гледзячы на тое, што матар'ял быў зьмешчаны тыдзень назад як у «Правдзе», так і ў «Зьвязьдзе». Ня ведалі аб ім ні сакратар Белкамітэту саюзу мэталістых т. Сапожнікаў, ні сакратар саюзу швэйнікаў т. Баранчук, ні работнік саюзу дрэваапрацоўшчыкаў тав. Ляўчук, ні работнік саюзу харчавікоў, якому было соромна назваць сваё прозьвішча. Ці могуць такія работнікі агітаваць за новыя формы сацспаборніцтва, ударніцтва і вытворчай работы, ці могуць яны сапраўды накіроўваць энтузіязм мас ў патрэбным напрамку, **калі яны нават газэт ня чытаюць?**

Вось пры якіх абставінах праходзіць прапрацоўка кантрольных лічбаў. Гаспадарчыя і прафесыянальныя арганізацыі абмяжоўваюцца правядзеньнем гэтае работы ў габінэтным нарадку. На большасьці прадпрыемстваў прапрацоўка кантрольных лічбаў нават яшчэ не пачата. Прафарганізацыі і гаспадарнікі ў цэлым радзе месц апартуністычна аднесьліся да гэтай важнейшай палітычнай справы, забываючы, што прамфінпляны могуць быць пасьпяхова выкананы толькі ў тым выпадку, **калі кожны рабочы будзе ведаць свой плян, калі кожны рабочы будзе актыўна ўдзельнічаць у яго прапрацоўцы.**

***

XVI партзьезд у рэзалюцыі па дакладу тав. Швэрніка паставіў перад прафсаюзамі задачу актыўнага ўдзелу ў складаньні гаспадарчых пляноў: **«Прафсаюзы павінны пры складаньні гаспадарчага пляну выступаць з канкрэтнымі прапановамі на падставе ўліку ўсіх заўваг і паказаньняў рабочых мас і прафсаюзных арганізацый як па плянах асобных галін прамысловасьці, так і па ўсім пляне ў цэлым».** Між тым выпрацоўка і прапрацоўка кантрольных лічбаў прайшла **пры вельмі слабым удзеле прафсыянальных арганізацый.**

Трэба даць рашучы бальшавіцкі адпор усім тым, хто імкнецца важнейшую справу прапрацоўкі кантрольных лічбаў зьвесьці да фармальнага адбыцьця павіннасьці. Трэба мабілізаваць шырокія масы рабочых на прапрацоўку кантрольных лічбаў, трэба дабіцца максымальнага пашырэньня практыкі прадпрыйняньня «сустрэчных прамфінпляноў» рабочымі кожнага прадпрыемства. Для кожнага павінна быць ясна, што ад посьпеху гэтай работы будзе ў значнай ступені залежыць выкананьне кантрольных лічбаў 1930-31 году.

П.

На нарадзе пры ЦК КП(б)Б

Задачы работы сярод яўрэйскіх працоўных мас

Уступнае слова т. Гантмана

У нацыянальнай рабоце ў нас у БССР мы маем вялікія дасягненьні. Тое самае і ў яўрэйскай рабоце. Але разам з тым заўважваецца паслабленьне ў рабоце сярод яўрэйскіх працоўных мас. Гэта заўважваецца ня толькі ў культмасавай рабоце, але і ў эканамічнай. Прычынай зьяўляецца не ліквідацыя яўрэйскага бюро. Пры ліквідацыі яўрэйскага бюро пастаноўлена яўрэйскую работу перанесьці ва ўсе аддзелы партыйнай работы і асабліва ўзмацніць яе па лініі савецкай. Партыйныя аддзелы яшчэ не пераключыліся на гэтыя новыя рэйкі.

Галоўнай прычынай паслабленьня яўрэйскай работы, трэба лічыць дэмабілізацыйныя настроі сярод часткі яўрэйскіх работнікаў, якія раней праяўлялі вялікую зацікаўленасьць да работы сярод яўрэйскіх працоўных мас.

Ёсьць група работнікаў, якая раней папала (пад агонь крытыкі за свае праваапартуністычныя скрыўленьні і зараз зусім адышла ад работы. Гэта паказвае, што гэтыя таварышы не зразумелі сваіх недахопаў і не зразумелі правільнай лініі партыі. Правы апартунізм гэтай групы павінен быў у нас атрымаць рашучы ўдар. Але гэты ўдар павінен быў прымусіць групу даказаць на практыцы іх гатоўнасьць выправіць недахопы і праводзіць лінію партыі.

Частка таварышоў прабуе тлумачыць прычыны паслабленьня работы быццам тым, што няма яскравай лініі, выразных фармулёвак галоўных пытаньняў гэтай работы. Гэта зусім няправільна. У нас ёсьць выразная лінія, мы ведаем, задачы падработы, праблемы і пытаньні, якія партыя ставіць для вырашэньня. Возьмем эканамічную галіну яўрэйскай работы. Упершае, зямлеўпарадкаваньне і перасяленьне. Ёсьць погляд, што пытаньня перасяленьня ўжо зараз няма, што мы яго зусім вырашылі, бо мы зараз маем на мясцох вялікі попыт на рабочую сілу, можна лягчэй паступіць на работу і г. д. Гэта зусім няправільна. Мы яшчэ маем досыць людзей, якія могуць нерасяліцца і адчуваюць патрэбу ў дапамозе. Па пытаньні калгаснага будаўніцтва вядомыя таварышы лічаць, што мы ня маем установкі, што рабіць зараз—будаваць нацыянальныя або інтэрнацыянальныя калгасы. Гэта вялікая памылка. Установка ў нас ёсьць.

Былі «левыя» загібы пры калектывізацыі інтэрнацыянальных калгасаў. Шляхам адміністраваньня, пад націскам, прымушалі ствараць зьмешаныя калгасы, ня лічучыся з тым, што для гэтага патрэбна адпаведная падрыхтоўка. З прычыны гэтага мы мелі адліў з гэтых калгасаў і развал некаторых з іх. Мы рашуча ўдарылі па гэтых перагібах, аднак адсюль не выцякае, што білі на ўсім калектыўным фронце, як ударалі па «галавакружэньнях» і перагібах. аднак адсюль не выцякае, што нам непатрэбна працягваць работу па інтэрнацыяналізацыі калгасаў, але тут патрэбна вялікая падрыхтоўчая работа і асабліва захаваньне прынцыпу добраахвотнасьці. З другога боку мы не адмаўляемся ад нацыянальных калгасаў, якія трэба падтрымліваць і ўтвараць.

Местачковая праблема. Мы маем тут вялізарнае дасягненьне. Мы ня маем тут патрэбнага пералому на ўсяй местачковай структуры. У значнай меры вырашана пытаньне аб беспрацоўі ў мястэчку. Аднак ня маюць рацыі і тыя, якія кажуць, што мы зараз ня маем ужо што рабіць і ў мястэчках. Мы яшчэ ня выкарыстаў ўсіх магчымасьцей уцягнуць у вытворчую работу мястэчковае насельніцтва, узьяднаць эканамічнае становішча мястэчка. Мы яшчэ ня зусім добра правялі работу ў разьвіцьці мясцовай прамысловасьці, а таксама слаба праходзіць яна і ў гарадзкой гаспадарцы, дзе таксама яшчэ ёсьць беднота, якую трэба паставіць на моцныя пазыцыі. На лініі саматужна-прамысловай кааперацыі мы таксама маем вялікія дасягненьні. Аднак, яны нас таксама ня могуць задаволіць. Таму што саматужна-прамысловая кааперацыя яшчэ ўжывае старыя формы працы ў яе абмяжаванай прамысловай прадукцыі.

Мы маем зараз новыя магчымасьці працаваць на мясцовай прамысловасьці, арцелі, на гарадзкой вытворчасьці і г. д. Праўда, мы маем цяжкасьці ў дастаўцы матар'ялаў, машын і г. д. Больш інтэнсыўнай работай можна было дабіцца, ва ўсякім выпадку, адпаведных больш значных вынікаў.

У культмасавай рабоце мы таксама маем вялікія дасягненьні. Разьвіцьцё культмасавай работы мае шмат цяжкасьцей, пашыраная цяга ў школы, усеагульнае навучаньне, ставіць перад намі вострa пытаньне аб пэдагагічных кадрах. Трэба адшукаць шляхі як гэта вырашыць. Палітмасавая работа, як па партыйнай лініі і яшчэ больш па прафэсыянальнай слаба абслугоўвае нацыянальныя меншасьці. Прафэсыянальныя органы ня ставяць перад сабой пытаньня аб абслугоўваньні нацыянальных меншасьцей на іх роднай мове, бібліятэкай, літаратурай і г. д. Партыйныя арганізацыі таксама не дапасаваліся весьці растлумачальную работу сярод членаў партыі на іх мовах.

У зьвязку з абвастраньнем клясавай барацьбы ў нас і наступленьня на капіталістычныя элемэнты актывізуецца яўрэйскі нацыяналізм і прабуюць падняць голаву правыя апартуністы, якія прыходзяць са сваімі кампрамісамі, уступкамі нацыяналізму. «Левыя» льлюць ваду на млын правых. Супроць іх трэба весьці рашучую барацьбу за перамогу генэральнай лініі партыі.

Нарада павінна распрацоўваць прапановы, як разгортваць работу сярод яўрэйскай працоўнай масы, намеціць вехі гэтай работы, выявіць прычыны паслабленьня работы. Асабліва зараз трэба зьвярнуць увагу на тое, каб пры ліквідацыі акруг работа была перанесена ў раёны. Зараз стаіць пытаньне аб утварэньні аддзелу нацменшасьці пры райвыканкомах. Яўрэйскія саветы, зразумела, павінны застацца. Павінна быць вырашана пытаньне аб сталым інструктары пры ЦК КП(б)Б, праз якога ЦК праводзіў-бы рэгулярна кантроль і агляд, як праводзяцца дырэктывы партыі адносна напрадоты. Матар'ялы паралы дапамогуць бліжэйшаму пленуму ЦК КП(б)Б вырашыць пытаньне аб напрадоце ў новых формах, якія стаяць зараз перад намі.

Спрэчкі па дакладу тав. Гантмана

Тав. **Чарнабародаў** (Наркамасьветы). Трэба стварыць новыя кадры для яўработы. Мы маем цэлы рад настаноў цэнтральных партыйных органаў аб рабоце сярод яўрэйскіх працоўных мас і зараз трэба праверыць як гэтыя пастановы выконваюцца. Напрыклад, ёсьць пастанова аб стварэньні яўрэйскага аддзяленьня пры Камвузе Беларусі. Ужо прайшло пяць месяцаў і гэта пастанова пісіць у паветры. Даводі часта мы сустракаем пропідзеньні прафсаюзаў у правядзеньні работы сярод рабочых нацменшасьцей. Пры ліквідацыі акруг трэба сур'ёзна заняцца пытаньнем аб узмацненьні работы ў раёне. Мы павінны мець раённых штатных працаўнікоў, а ў буйных гарадох інспэктароў асьветы. Наша выдавецкая работа таксама падрываецца з-за адсталай тэхнічнай базы. Замест тысячы друкаваных аркушаў на яўрэйскай мове за год друкарня больш 30-ці друкаваных аркушаў у месяц не дае.

Тав. **Гутман** (Калгасцэнтр). Зусім правільна, што за апошні час работа сярод нацменшасьцей паслабла. З адпушчаных 800 тысяч рублёў на гаспадарчае ўпарадкаваньне мястэчка ўсяго выдаткавана на гэту мэту калі 500 тысяч рублёў. Друк наш мала месца ўдзяляе пытаньням работы сярод нацменшасьцей.

Тав. **Сакольскі** (Белкамэст). Мы дапусьцілі цэлы рад «левых» загібаў у камплектаваньні яўрэйскіх калгасаў. Але прычына выхаду яўрэйскіх калгасьнікаў з калгасаў тлумачацца не перагібамі, а, галоўным чынам, жылыёвым крызісам. Ня гледзячы на гэта, мы маем вялізарны прыліў у калгасы. Падам некаторыя лічбы: у 1929-30 г. лік местачковай беднаты ў калгасах павялічыўся па параўнаньні з 1928-29 годам у Магілеўскай акрузе на 45%, у Аршанскай—на 61%, у Мазырскай—на 165%, у Бабруйскай—на 166% і ў Гомельскай—на 169%. Гэты рост мы маем за адзін год. Яўрэйскія калгасы значна ўмацаваліся і таварнасьць гэтых калгасаў павялічылася.

Тав. **Окунь** (Яўпэдтэхнікум). У радзе партарганізацый праца сярод нацменшасьцей ня ўключаецца ў штодзённую работу. Рэдка калі ў справаздачах Віцебскага АК КП(б)Б мы чулі аб нацработе. Нашы кантрольныя камісіі таксама мала кантралююць як праводзіцца работа сярод нацменшасьцей. Кампамоду дадзена дырэктыва аб правядзеньні ў Віцебску канфэрэнцыі яўрэйскай рабочай моладзі, але канфэрэнцыя была сарвана з прычыны малой зацікаўленасьці ў гэтым партыйнай арганізацыі.

Тав. **Бунін** (Наркамфін). Партыйная лінія ў правядзеньні работ сярод яўрэйскіх працоўных зусім правільная, але мы яе слаба выконваем. Трэба пераглядзець мэтады і формы яўработы. Мы далі дырэктыву, каб паленшыць становішча членаў сем'яў заматужнікаў, аб больш выразным клясавым падыходзе пры ападаткаваньні. Дырэктыва гэта ня выконваецца. Я лічу, што планы, якія тут выпрацоўвалі для ўпарадкаваньня мястэчак, зьяўляюцца нежыцьцёвымі.

Тав. **Пам** (Бабруйск). Мы зараз адстаем з яўработай ад агульных тэмпаў нашага будаўніцтва. Няма самакрытыкі у яўрабоце, робяць памылкі і не признаюць іх. Тыя, хто дапускае памылкі, стаіць сваё «я» вышэй партыі. З прычыны вялізарных тэмпаў нашага будаўніцтва мы маем у мястэчку рад зьмен. Мястэчка ўжо ня тое, якім было некалькі год таму назад. У мястэчку зараз адбываюцца новыя зрухі. Зусім правільна думка аб стварэньні ў мястэчках буйных калектыўаў малочных гаспадарак, агародных і сьвіноводных гаспадарак. Такія гаспадаркі нам дапамогуць вырашыць агародную праблему і мясны крызіс.

Тав. **Цэнцыпэр** (Белазэт). Мы ня ведаем, што робіцца зараз у мястэчку, якія працэсы там адбываюцца. Мы толькі займаемся ўражаньнямі мястэчка. Няма пэўных лічбаў, матар'ялаў, ня маючы аналізу мястэчка, мы выпрацоўваем абстрактныя пляны. За тое мы мелі ў адным месцы такое становішча, калі 200 тысяч рублёў засталіся невыкарыстанымі на гаспадарчае ўпарадкаваньне мястэчка. Сампрамкааперацыя яшчэ не перебудавалася, яна ня выканала партыйных дырэктывы аб рабоце на мясцовым сырцу. Мы адчуваем недахват у будаўнічых матар'ялах; па-мэнту, вапны, цэглы дрэнны, а ўсіх гэтых матар'ялаў ёсьць даволі ў Беларусі, але сампрамкааперацыя ўжывае выключна дэфіцытны сырэц. Такая работа нікуды ня варта. Культмасавая работа сярод яўрэйскіх працоўных недапушчальна адстае.

АГЛЯД РАБОТЫ КЛЮБНЫХ ГУРТКОЎ САМАДЗЕЙНАСЬЦІ

Пазаўчора ў культсэктары ЦСПСБ пад старшынством прадстаўніка УсеЦСПС адбылася шырокая нарада па пытаньні агляду работы гурткоў самадзейнасьці пры прафсаюзных клюбах.

У нарадзе прынялі ўдзел загадчыкі клюбаў, кіраўнікі гурткоў, прадстаўнікі культсэктараў ЦП паасобных саюзаў, фабзаўмясцкомаў і рэдакцый газэт.

Выступаўшыя таварышы адзначылі свячасовасьць і неабходнасьць правядзеньня першага на Беларусі агляду гурткоў самадзейнасьці. Большасьць кіраўнікоў гурткоў і клюбнага актыву да гэтае справы з боку Галоўмастацтва, культсэктару ЦСПСБ і ўсёй прафсаюзнай грамадзкасьці.

Былі такія выпадкі, калі праўленьні некаторых клюбаў, замест абмену вопытам працы з іншымі клюбамі, ўтваралі з сваіх мастацкіх гурткоў нешта загадчык клюбу друкаваў тав. Нетэс «пусьціў» свой драмгурток на сцэну клюбу бухгалтэраў.

Т. т. Шульман, Дорскі, Арыярскі і інш. гаварылі аб адсутнасьці адпаведнага рэпэртуару ў гурткох самадзейнасьці, аб тым, што місьменьніцкія арганізацыі БССР, у прыватнасьці БелАПП, не заўсёды ахвотна ідуць на дапамогу гуртковцам у стварэньні ідэйна-вытрыманага рэпэртуару для сцэны малых форм.

Агляд павінен даць рашучы пералом у гэтых адносінах, значна ўзьняўшы і паленшыўшы культработу ў нашых клюбах.

Нарада выказалася за працяг раней вызначанага тэрміну агляду ў паўтара месяцы—яшчэ на месяц. Такім чынам, уся работа па агляду будзе скончана толькі ў кастрычніку.

Няўзабаве пры ўсіх буйных прадпрыемствах будуць арганізаваны ў дапамогу агляду ўдарныя брыгады.

Нарада абрала рэспубліканскі штаб кіраўніцтва аглядам, у які ўвайшло 17 асоб.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Задачы сацыялістычнай рэканструкцыі патрабуюць новых форм і мэтадаў работы партячэек

Больш палітычнай пільнасьці ў барацьбе за генэральную лінію партыі, больш гібкасьці і паваротлівасьці па арганізацыі мас на выкананьне высокіх тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва

Павесьці работу па-новаму

Тав. Кагановіч у сваім дакладзе на XVI зьезьдзе УсеКП(б) сказаў, што зараз уся работа павінна быць пабудавана так, каб «ПАРТЫЙНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ УВЕСЬ ЧАС БЫЛА ПАВЕРНУТА ТВАРАМ ДА ВЫТВОРЧАСЬЦІ, ДА ЦЭХУ, ДА ВЫКАНАНЬНЯ ТЫХ БАЯВЫХ ЗАДАЧ, ЯКІЯ ПЕРАД НАМІ ПАСТАЎЛЕНЫ ЎСЁЙ ПАЛІТЫКАЙ І ГЕНЭРАЛЬНАЙ ЛІНІЯЙ НАШАЙ ПАРТЫІ».

Стаяць тварам да баявых задач, якія пастаўлены генэральнай лініяй партыі перад усімі партыйнымі арганізацыямі, — значыць шырока і пабаявому ахапляць партыйнай работай усе шматграныя вучасткі сацыялістычнага будаўніцтва як у горадзе, так і на вёсцы. Ахапіць як мага паўней і шырэй партыйным уплывам, партыйнай работай гэтыя вучастні, дабіцца лепшай якасьці ў рабоце і кіраўніцтве, партыйныя арганізацыі і ячэйкі змогуць толькі пры умове кутчай і ўмелай перабудовы свае работы, уцягненьнем у яе пагалоўна ўсіх членаў партыі.

На радзе прадпрыемстваў, у радзе вясковых парт'ячэек, у перабудове партработы некаторы зрух ужо ёсьць. І гэтыя першыя кроні ў перабудове работы адразу далі сябе адчуць. Аднак, яшчэ далёка ня ўсе партарганізацыі сталі на шлях перабудовы сваёй работы, працуюць па-старому, робячы надапушчальныя прабелы ў выкананьні задач партыі. На радзе прадпрыемстваў партыйныя арганізацыі не паставілі на адпаведную вышыню барацьбу за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, за павышэньне якасьці прадукцыі і г. д., таму што не дастасоўваюць новых форм і мэтадаў работы, ня ўжываюць больш масавых і гібкіх прыёмаў у рабоце.

У вясковых ячэйках яшчэ больш марудна, чым у вытворчых адбываецца перабудова партработы. На сёньняшні дзень яшчэ ёсьць такія вясковыя ячэйкі, якія ня сталі тварам да вытворчага жыцьця калгасаў, да ажыцьцяўленьня задачы гаспадарчага замацаваньня калгасаў. Гэтыя ячэйкі ўсё яшчэ па-старому вядуць сваю работу, не набылі баявых тэмпаў у справе хуткага ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі ў практычнай рабоце. Гэтыя ячэйкі павінны НЕАДКЛАДНА ПЕРАКЛЮЧЫЦЦА, ПЕРАБУДАВАЦЦА так, каб як мага больш поўна, як мага больш шырока, арганізуючы вакол сябе калгасьнікаў, батрацтва, беднату і серадняку ажыцьцяўляць задачы па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Не фармальна, а па-баявому перабудоўваць работу

У пачатку бягучага году пізавыя арганізацыі КП(б)Б пачалі перабудоўваць сваю работу па функцыянальнай сыстэме, па прыкладу партарганізацый перадавых прадпрыемстваў Савецкага Саюзу (Электразавод у Маскве, электрасіла ў Ленінградзе).

Новая сыстэма партработы яшчэ пакуль што ня выкрышталізавалася ў пэўныя цьвёрдыя формы. На мясцох кожная арганізацыя, кожны парткалектыў перабудоўваюцца па-свойму. Толькі ў працэсе практычнай работы выявіцца як лепш паставіць работу партгруп, якія сэктары найбольш жыцьцёвыя і як лепш паставіць іх работу. Дзеля таго, каб дэтальна вывучыць становішча перабудовы партработы на мясцох, каб абагуліць набыты вопыт і тыя формы, якія найбольш сябе апраўдалі і потым распаўсюдзіць на ўсе партыйныя арганізацыі, ЦК КП(б)Б арганізаваў брыгады з студэнтаў Сьвярдлоўскага і Ленінградзкага камвузу і паслаў для работы па вывучэньні і дапамозе перабудовы партработы.

Адна з такіх брыгад, у якую ўваходзіць тры таварышы, працавала **на двух буйных прадпрыемствах Гомельшчыны: завод імя Ланцуцкага і фабрыка «Гэрой Працы».**

Гомельскі акругком КП(б)Б яшчэ ўзімку арганізаваў кароткатэрміновыя курсы для сакратароў парт'ячэек, на якіх прапрацоўвалася пытаньне аб новых формах партработы. Былі таксама даны на мясцох адпаведныя дырэктывы па гэтым пытаньні. Аднак, ня гледзячы на гэта перабудова партработы ў пізавых арганізацыях прайшла фармальна, а ў некаторых арганізацыях нават не пачата зусім. Так, на заводзе імя Ланцуцкага, а таксама і на фабрыцы «Гэрой Працы» на пасяджэньнях бюро парткалектываў было пастаноўлена арганізаваць сэктары і вучасткі парт работы. Запісалі пастанову і на гэтым супакоіліся, а работа ідзе паранейшаму: тыя-ж пасяджэньні і нарады, тая-ж ніякая адказнасьць за выкананьне даручанай партнагрузкі, як і раней усю работу «вязе» сакратар парт'ячэйкі і асобныя актывісты, члены партыі ў цэху.

Пры дапамозе брыгады студэнтаў камвузу партарганізацыі заводу імя Ланцуцкага і «Гэрой Працы» пераабралі парторганы на брыгадах і вытворчых групах і замацавалі адзін дзень у месяц для работы партгруп, стварылі асобныя сэктары і вучасткі пры парткомах і цэх'ячэйках. Брыгадзіры праінструктавалі кіраўнікоў сэктараў і вучасткаў і раздалі ім палажэньне аб іх рабоце. Зараз задачай бюро цэх'ячэек зьвяўляецца замацаваць набыты зрух у партрабоце і павесьці ў будучым сваю работу па-новаму, па-баявому. Кіруючыя органы партарганізацый павінны часьцей правяраць і інструктаваць цэхавыя ячэйкі ў галіне ажыцьцяўленьня новых форм партработы.

З тае практыкі, якая ўжо ёсьць з перабудовы партработы ў некаторых арганізацыях можна памеціць і раіць ужо тыя формы, якія найбольш жыцьцёвы і адпавядаюць задачам партыі, якія пастаўлены на даным эт

Ударым па недаацэнцы сьвінагадоўлі

БУДАЎНІЦТВА СЬВІНАВОДНЫХ ГАСПАДАРАК ІДЗЕ ВЕЛЬМІ МАРУДНА

Саўгасы, калгасы, камсамол---на сацыялістычнае спаборніцтва па хутчэйшым вырашэньні мясной праблемы!

БУДАЎНІЦТВА СПЫНІЛАСЯ

Безадказныя будаўнікі наносяць страты калгасам

(Ад нашага магілеўскага карэспандэнта)

Нядаўна на старонках «Зьвязды» мы ўжо сыгналізавалі аб тым, што будаўніцтва сьвіных гаспадарак у Магілеўшчыне разгортваецца вельмі марудна. Мы ўжо зварочвалі на гэта ўвагу партыйных і савецкіх арганізацый. На жаль, частка раёнаў як і раней нічога ня робіць.

Цяпер, калі па акрузе разгарнулася ўборачная кампанія, калгасьнікі заняты ўборкай, будаўніцтва сьвінарнікаў у некаторых раёнах зусім спынілася. Няма ніякай гарантыі, што будаўніцтва будзе скончана ў тэрмін. Пакуль што пачата будаўніцтва 75 сьвінарнікаў—51 проц. пляпавага заданьня. У паасобных раёнах справа абстаіць яшчэ горш. Напрыклад, Чаўскі раён нават не пачынаў будаўніцтва і толькі гэтымі днямі скончыў заготоўку матар'ялаў. Ня лепшае становішча і ў Крычаўскім раёне, дзе з 13-ці сьвінарнікаў будуецца толькі 6, у Магілеўскім з 14 таксама 6. Больш здавальняюча ідзе будаўніцтва ў Чачавіцкім і Шклоўскім раёнах, але і тут у апошнія дні будаўніцтва затрымалася.

З тае прычыны, што будаўніцтвам у акрузе фактычна ніхто ня кіруе, **некаторым калгасам нанесены страты.** Пры вызначэньні будаўніцтва сьвінарнікаў незаўсёды ўважліва адносіліся да гэтай справы, вызначалі зусім неаднаведнае месца, у выніку прыходзілася перавозіць матар'ялы з аднаго месца на другое. Такія факты былі ў Касьцюковіцкім раёне ў калгасе «Савецкая Беларусь» і ў Бухара-Пралетарскім камуне, а таксама і ў Чаўускім раёне ў саўгасе «Ялава». Калгасы панесьлі страты на 600 руб., а саўгас «Ялава» на 4.000 рублёў.

Раённыя партыйныя і савецкія арганізацыі будаўніцтвам сьвіных гаспадарак зусім ня кіруюць і ня сочаць за яго ходам. Для ўкамплектаваньня сьвіных гаспадарак ёсьць покуль што 3.958 сьвіноматак—15,7 проц. пляну.

А. Сянькевіч.

Зрываюць будаўніцтва сьвіных гаспадарак

Будаўніцтва сьвіных гаспадарак і ўкамплектаваньне іх маткамі ў калгасах Любанскага раёну знаходзіцца пад пагрозай зрыву. **Раённыя арганізацыі не мабілізавалі ўвагу калгасьнікаў** на выкананьне важнейшай дырэктывы партыі і ўраду. Калгасы замест таго, каб у першую чаргу будаваць сьвінарнікі, будуюць кароўнікі.

З 13-ці калгасаў, дзе павінна было пачацца будаўніцтва сьвінарнікаў, апошнія будуюцца толькі ў двух—у калгасе «Асьветнік» і ў калгасе «Ленінскі Шлях». Іншыя калгасы **будаўніцтва не распачалі** і пад рознымі прычынамі ўвільваюць ад гэтае справы. Камуна імя Беларускай Вайсковай акругі на Мар'іне намячае набудову сьвіной гаспадаркі на 500 сьвіноматак, але да будаўніцтва **яшчэ не прыступлена.**

Раённы малочна-жывёлагадоўчы саюз не зварачае ніякай увагі на будаўніцтва, зусім не інструктуе калгасы. У калгасах няма **тыповай схэмы пабудовы сьвінарнікаў.** Калгас «Асьветнік» пачаў будаваць сьвінарнік на 100 матак бяз усякага пляну.

На будаўніцтва сьвінарнікаў у раёне адпушчана 150.000 руб. крэдыту, **але большасьць калгасаў гэтых крэдытаў не атрымліваюць.** Для будаўніцтва не хапае цэглы, цэмэнты жалеза, у раёне-ж гэтым пытаньнем ня цікавяцца.

Калгасьнікі спасылаюцца на тое, што яны ня змогуць укамплектаваць сьвінарнікі. Як-жа абстаіць справа з сьвіномататным матар'ялам для ўкамплектаваньня сьвінарнікаў? Для калгасаў патрэбна 1.700 сьвіноматак, на сёньняшні дзень ужо ёсьць 50 проц. гэтай лічбы. Між тым, шмат калгасьнікаў і рабочых саўгасаў маюць добрых сьвіноматак, якіх яны пачынаюць адкармліваць, каб потым калоць. Гэтыя сьвіноматкі можна абмяняць на калгасных ярукоў, калгасьнікі ахвотна згодзяцца на такі абмен. Калгас «Асьветнік» ужо набыў шляхам абмену 34 сьвіноматкі. Індывідуальнікі — беднякі і сярэднякі ідуць насустрач калгасу. Яны кажуць: «трэба дапамагчы калгасу, бо і мы там хутка будзем».

Калгас «Асьветнік» ужо скончыў будаўніцтва сьвінарнікаў і ўкамплектаваньне іх. Калгасы Бабруйшчыны павінны раўняцца па калгасу «Асьветнік», які падае добрыя прыклады арганізацыі сьвінагадоўчых гаспадарак.

Брыгадзір ЖУКАЎ.

Сьвіноматка з парасятамі

З ФРОНТУ СЬВІНАГАДОЎЛІ

— Калгас імя Зьвязды ў Касьцюковіцкім раёне ўжо канчае будаўніцтва сьвінарнікаў і набыў сьвіноматак. Наогул калгасы забясьпечаны племяннымі сьвіноматкамі. Будаўніцтва тармозіцца з прычыны адсутнасьці крэдытаў. З асыгнаваных 219 тысяч руб. покуль што пераведзена толькі 27 тысяч.

— Аршанскі раённы малочна-жывёлагадоўчы саюз зусім ня кіруе будаўніцтвам сьвінных гаспадарак, якое ідзе самацёкам. З пяці калгасаў сьвінарнікі будуюцца толькі ў двух і то вельмі марудна. Нічога ня робіцца для ўкамплектаваньня гаспадарак сьвіноматкамі. Будаўніцтва сіласных ям і вежаў амаль не пачата, па ўсім раёне ёсьць пяць сіласных ям.

Н.

— У саўгасе «Чырвоны Маяк» павінна быць пабудавана 12 сьвінарнікаў на 2250 сьвіней, але гэта ў плянах. На справе дагэтуль ня вызначана месца для сьвінарнікаў і гаспадарчых будынкаў. З 3000 кубамэтраў патрэбнага лесаматар'ялу атрымана 120 к. м.

ДЗЯНІСАЎ.

— У калгасе «Авангард», Смалявіцкага раёну, вельмі дрэнна даглядаюць за сьвіньмі. Пачынаючы з вясны ў калгасе здохла 100 штук сьвіней. Сьвіней трымаюць у брудных і цесных хлявох. У калгасе ня быў ні разу ветэрынарны доктар, каб дапамагчы калгасьнікам змагацца з хваробамі сярод сьвіней.

Брыгадзір «Зьвязды» ПАЛЯНСКІ.

— Сьвінаадкормачны пункт у спажывецкім т-ве «Калгасьнік» (Віцебскі раён) мае 20 сьвіноматак і 64 парасят. Але догляд за сьвіньмі нядобры. Сьвіньні знаходзяцца ў цесных памяшканьнях і цэлымі днямі стаяць у гнаі. З гэтай прычыны пачалі дохнуць парасяты. Корм для сьвіней адпускаецца нядобраякасны. Праўленьне т-ва і райкалгасаюз ня прымаюць ніякіх мер для правядзеньня сьвінарнікаў у парадак.

ЗАЦІКАЎЛЕНЫ.

— У камуне «Зара» (Гарадоцкагараёну) ёсьць 130 сьвіней і шмат іншай жывёлы,—усяго 265 штук. Прадукцыйнасьць жывёлы вельмі нездавальняючая. Тлумачыцца гэта непскім доглядам і непрыстасаванасьцю хлявоў і кармушак. Ёсьць калгасьнікі, якія вельмі нядбайна адносяцца да сваіх абавязкаў. Корм жывёле часта даюць несвяўчасова. Гэта прыяло да таго, што сьвіньні часьцей хварэюць і дохнуць. Ня гледзячы на пастанову агульнага сходу калгасьнікаў аб прыняцьці тэрміновых мер для папярэджаньня хвароб сярод жывёлы, праўленьне да гэтага часу нічога не зрабіла.

Ад.

Падрыхтуем кадры сьвінаводаў

У мэтах забесьпячэньня кадрамі жывёлагадоўчай гаспадаркі, былая Беліцкая сельска-гаспадарчая прафшкола малочнай гаспадаркі (Віцебская акруга) рэарганізавана ў малочны тэхнікум. Умовы для навучаньня і работы ў тэхнікуме спрыяючыя, ёсьць інтэрнаты, будынкі для навучальнай установы, саўгас у 800 гэкт. з племянным стадам буйнай рагатай жывёлы каля 300 штук, хлеў адзін з лепшых у БССР, мэханізаваны масласырзавод. Сюды трэба яшчэ дадаць блізасьць ад чыгункі (1½ кілёмэтры).

Барысаўскі сельска-гаспадарчы тэхнікум пераданы саюзнаму трэсту «Сьвінавод» для падрыхтоўкі кадраў па сьвінагадоўлі. Было-б зусім мэтазгодным перавесьці барысаўскі тэхнікум у Беліцу і стварыць там два аддзяленьні: па жывёлагадоўлі і малочнай справе. Гэта з'эканоміла-б дзяржаўныя сродкі, дзякуючы поўнаму скарыстаньню лябараторый, памяшканьняў, спэцыялістых і г. д.

Наркамзем павінен таксама паскорыць афармленьне перадачы Беліцкага саўгасу пад кіраўніцтвам тэхнікуму. Наркамзем павінен адпусьціць сродкі на ўтрыманьне тэхнікуму, бо дагэтуль прафшкола знаходзілася на раённым бюджэце.

Усе гэтыя пытаньні павінны быць вырашаны ў тэрміновым парадку, бо навучальны год ужо набліжаецца.

ПЕРАПЕЧКА, ЮДЭЛЬСОН.



Чырвоны абоз калгасьнікаў прывёз збожжа на ссыпны пункт.

На барацьбу са спэкуляцыяй збожжам

Вельмі важнай задачай пасьляхова-га разгортваньня хлебазагатовак зьяўляецца змаганьне са спэкуляцыяй збожжам і мяшочніцтвам.

У асноўных хлебазагатоўчых раёнах Саюзу ўжо наглядаецца наплыў мяшочнікаў са спажывецкіх раёнаў з даведкамі і пасьведчаньнямі савецкіх органаў аб іх патрэбе ў хлебе і нават аб дазволе купляць і перавозіць збожжа.

Каб папярэдзіць гэткае зьявішча, і ў БССР, Наркангандаль БССР запрапанаваў усім акруговым інспэктарам гандлю ўжыць рашучыя меры барацьбы з мяшочніцтвам, даць адпаведныя дырэктывы райвыканкомам, міліцыі і сельсаветам. Прад'яўленьне пасьведчаньняў і даведак не дае права на куплю і перавозку збожжа. Сурова забараняецца выдача даведак і пасьведчаньняў каму-б там ні было. Гэтыя даведкі ніякай сілы ня маюць і будуць толькі выклікаць ліпшія выдаткі тых, хто едзе за збожжам.

Усякія даведкі павінны затрымлівацца і пасылацца ў той РВК, у раёне якога ўстанова выдала дакумант, для прыцягненьня да суровай адказнасьці.

Нарада пры Наркамгандалі дазволіла Саюзхлебу спыніць выдачу хлебапраадуктаў і тары тым арганізацыям, якія не зварачаюць тару. Двухтыднёвік мабілізацыі тары працягнуты да 10-га жніўня.

Усебеларускі зьезд будаўнікоў

2 жніўня вечарам у клюбе саўгандальслужачых адчыніўся 9 усебеларускі зьезд будаўнікоў. На зьезд прыбыло 150 дэлегатаў. На зьезьдзе прысутнічае адказны сакратар ЦК саюзу будаўнікоў тав. **Змічаў.**

З дакладам аб міжнародным і ўнутраным становішчы выступіў прадстаўнік ЦК КП(б)Б тав. **Гантман.**

Зьезд таксама заслухаў даклад адказнага сакратара ЦК саюзу будаўнікоў тав. **Змічава** аб рабоце ЦК.

У спрэчках па абодных дакладах выказалася больш чым 20 дэлегатаў.

З рапартам ад падшэфнага палка выступіў камісар палка, які запэўніў зьезд, што палітычная і баявая падрыхтоўка каманднага і палітычнага складу палка ўзьнялася на належную вышыню.

Зьезд атрымаў прывітальную тэлеграму ад полацкай ўдарнай брыгады будаўнікоў імя 9 усебеларускага зьезду саюзу.

Ц.

Ленінскі „Рабкрин"—у раёны

У парадку прапановы

У зьвязку з ператварэньнем раёну ў вузлавы пункт практычнага ажыцьцяўленьня палітыкі партыі на вёсцы, зьяўляецца патрэбнасьць арганізацыі ў раёне сталага органу КК РСІ. Раённая КК РСІ павінна быць рашучым змагаром за ўмацаваньне ленінскага адзінства партыйнай арганізацыі, бязьлітасна змагацца на два франты супроць правых, як найбольш небясьпечных, так і «левых» апартуністых, якія дапамагаюць правым, выкрываць і біць на прыміранцах да ўхілаў.

Раённая КК РСІ павінна своячасова папярэджваць праявы спаўзаньня паасобных частак апарату з клясавых пазыцый, папярэджваць, сыгналізаваць аб усялякіх хваравітых зьявішчах у партыйнай арганізацыі.

Раённая КК РСІ павінна быць арганізатарам працоўных мас для рашучага змаганьня з бюракратызмам, уцягваць масы ў сталы кантроль і праверку важнейшых пастаноў партыі па сацыялістычным будаўніцтве ў раёне. Выкананьне гэтыя асноўныя задачы раённая КК РСІ зможа пры ўмове прыцягненьня да сваёй работы шырокіх працоўных мас.

Пры арганізацыі гарадзкіх і раённых КК павінен быць дыферэнцыяваны падыход, з улікам эканамічных асаблівасьцяй гораду і раёну. Па нашай думцы, апарат гарадзкіх і раённых КК павінен быць арганізаваны так. Гарадзкія кантрольныя камісіі так званай першай групы арганізуюцца ў найбольш прамысловых буйных гарадзкіх цэнтрах БССР, якія налічваюць ад 2.500 камуністых і вышэй. Сюды трэба аднесьці такія пункты, як Гомель, Віцебск, і Менск. Штат гарадзкіх КК першай катэгорыі мяркуецца з 5 чалавек. У Бабруйску і Магілеве штат КК будзе складацца з 4-х чалавек.

Пры арганізацыі раённых КК РСІ, раёны падзяляюцца на тры катэгорыі. Да першай катэгорыі адносяцца гарады з вясковым раёнам, якія налічваюць ад 500 да 1.000 камуністых. Сюды адносяцца 5 раёнаў — Ворша, Полацак, Мазыр, Барысаў, Рэчыца са штатам у 4 чалавекі. Да другой катэгорыі адносяцца раённыя цэнтры, у якіх ёсьць паасобныя прамысловыя прадпрыемствы і вышэй 75 тыс. насельніцтва, і налічваюць ад 200 да 500 камуністых. У гэтых раёнах штат КК РСІ складаецца з 3-х чалавек. Такіх раёнаў мяркуецца вылучыць 30. Нарэшце, да трэцяй катэгорыі адносяцца 63 вясковых раёны са штатам раённых КК РСІ (ў 2 чалавекі. Усяго на 103 раёны патрабуецца 247 чалавек. Да гэтага часу па 8 акругах у апараце КК РСІ працавала 100 чалавек, улічваючы і тэхнічных работнікаў.

